**«ВЫ ВЫРАТУЕЦЕ ШМАТ ЖЫЦЦЯЎ!»**
Студэнты БДУ ствараюць для медыкаў вырабы на 3D-прынтарах
Стар. 2

**«ВЫТРЫМЛІВАЙЦЕ ДЫСТАНЦЫЮ»**
Прарэктар Аксана ЗДРОК распавяла прадстаўнікам моладзевых арганізацый, як змяніўся адукацыйны працэс у БДУ
Стар. 3

**ГЕРОІ ВАЙНЫ Ў НАШЫХ СЕМ'ЯХ**
Супрацоўнікі БДУ ўспамінаюць, як змагаліся за Перамогу іх бацькі
Стар. 4-5

**СТАРТАП–ШКОЛА «СІТА»**
Цэнтр развіцця моладзевага прадпрымальніцтва дапамагае студэнтам стварыць уласны бізнес
Стар. 6

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

18 мая 2020 года, № 8 (2230)




Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

# «Абвясціў сябе мабілізаваным…»

## Універсітэт адсвяткаваў 75-годдзе Вялікай Перамогі

**Бязмежная падзяка – менавіта з такім пачуццём у БДУ падрыхтавалі цыкл мерапрыемстваў у гонар Вялікай Перамогі. Тры тыдні, напоўненыя ўспамінамі, гістарычнымі фактамі і клопатам пра ветэранаў. Толькі ў першыя дні вайны 450 студэнтаў і супрацоўнікаў сышлі на фронт. Як занатавана ў гісторыі – «БДУ абвясціў сябе мабілізаваным…»**

Калі б прысвяціць хвіліну маўчання кожнаму загінуламу, то прыйшлося б маўчаць 20 мільёнаў хвілін, а гэта 38 гадоў бесперапыннай малітвы… Памяці ўсіх загінулых у час ВАВ была прысвечана 7 мая ўрачыстая ўніверсітэцкая акцыя. У гонар 12 Герояў Савецкага Саюза з ліку супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ была арганізавана выстава «Мы – нашчадкі Перамогі».

Са словамі падзякі да ўсіх ветэранаў звярнуўся рэктар **Андрэй КАРОЛЬ.**

– Свята Перамогі – адна з нямногіх падзей, якая напоўнена глыбокім сэнсам, зместам, а самае галоўнае – стваральным урокам усяму чалавецтву. Нам паказалі, наколькі важна пераўзыходзіць не фізічнай сілай, а моцай калектыўнага духу, розуму, цярпення і самаахвяравання.

Сёння вельмі сімвалічна, што ўрачыстая акцыя праходзіць у паўцішыні. Гэта магчымасць у маўклівым асэнсаванні мінулых і цяперашніх падзей зразумець сябе. І хай сённяшні свет адгароджваецца ад чалавека інфармацыяй, цана пераможцаў больш важкая. Таму што яна мае карані – само жыццё. А подзвіг быў, ёсць і будзе маўклівым запаветам нашчадкам – перамагаць толькі сябе.

Цану, якую заплацілі нашы блізкія і родныя за Перамогу, не вымавіць. Немагчыма вымераць кошт іх жыцця і лёсу. Яе можна вымераць толькі ўдзячным сэрцам нашчадкаў.

Андрэй Кароль пажадаў усім ветэранам і супрацоўнікам універсітэта здароўя, дабрабыту, мірнага неба і невычэрпнай веры ў светлую будучыню.

Працяг на с. 8

УНІВЕРСІТЭТ
18 мая 2020 года, № 8 (2230)



# «Вы выратуеце шмат жыццяў!»

## Студэнты БДУ ствараюць для медыкаў вырабы на 3D-прынтарах



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА



*Аляксандр Кузняцоў*



*Яўген Яўсейчык*

**Сёння ва ўсім свеце ідзе барацьба з каранавіруснай пандэміяй, у эпіцэнтры якой апынуліся работнікі медыцынскіх устаноў. У нашай краіне разгарнуўся шырокі грамадскі і добраахвотніцкі рух па дапамозе медыкам сродкамі спецабароны, ежай і абсталяваннем. Не засталіся ўбаку студэнты і супрацоўнікі нашага ўніверсітэта. Прадстаўнікі розных моладзевых арганізацый і падраздзяленняў аказалі дабрачынную дапамогу медустановам, а на механіка-матэматычным факультэце нядаўна была арганізавана вытворчасць расходных матэрыялаў для жыццёва неабходных апаратаў.**

Ініцыятыву трэцякурснікаў ММФ **Аляксандра КУЗНЯЦОВА** і **Аляксандра СПЕВАКА** падтрымала адміністрацыя ВНУ і дала чатыры 3D-прынтары для друку розных дэталяў апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх (ШВЛ) і сродкаў індывідуальнай абароны.

Затым да каманды далучыліся супрацоўнік інавацыйнай лабараторыі «ФабЛаб» ММФ **Яўген ЯЎСЕЙЧЫК** і загадчык лабараторыі Ліцэя БДУ **Яўген СКРАБНЁЎ.**

За некалькі дзён яны вырабілі каля 200 накрывак для ўвільгатняльнікоў кіслароду і 40 трымальнікаў для медыцынскіх масак. Усе яны былі перададзены ў 10-ю гарадскую клінічную бальніцу і Гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Таксама ў дадзены момант па просьбе медработнікаў вядзецца вытворчасць адаптараў для снорклаў – герметычных масак, якія выкарыстоўваюцца для штучнай вентыляцыі лёгкіх, абмяркоўваюцца ўмовы вытворчасці ахоўных медыцынскіх шчыткоў з выкарыстаннем лазернага разака.

### Першы заказ

«Усё пачалося з таго, што праз нашага былога ліцэйскага класнага кіраўніка *Таццяну Анатольеўну Кастырыну* да нас звярнуліся супрацоўнікі гнойнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы з просьбай вырабіць для іх 70 накрывак для кропак з кіслародам і 40 трымальнікаў для масак (гэта такія плоскія пласціны, якія дазваляюць мацаваць маску да галавы, а не да вушэй і абараняюць ад націрання), – распавядае *Аляксандр Спявак*. – Мы адразу ж звярнуліся да дэкана *Сяргея Міхайлавіча Басякова*, які, абмеркаваўшы з намі тэхнічныя магчымасці, даў у наша распараджэнне два 3D-прынтары з лабараторыі „ФабЛаб“. Яшчэ два прынтары і спецыяліста даў нам у дапамогу дырэктар Ліцэя БДУ *Ігар Мікалаевіч Варакса*».

Першы тыдзень сышоў на наладку абсталявання, ці, як кажуць студэнты, краш-тэсты. Яны здымалі памеры, шукалі і самі мадэлявалі 3D-выявы дэталяў. Пасля некалькіх спроб яны дамагліся прымальнай якасці і адэкватнага часу на выраб.

«Першапачаткова трэба знайсці трохмерную выяву патрэбнай дэталі, якая затым праз адпаведны софт – слайсер – загружаецца ў 3D-прынтар і пераводзіцца ў кіраваны код, – тлумачыць *Яўген Яўсейчык*. – Пасля чаго ён па каардынатах пачынае плавіць пластык і адпаведна выбудоўваць гэту мадэль. Неабходныя нам выявы мы ўзялі ў валанцёраў аб’яднання „Хакерспэйс“, якое іх выклала ў адкрыты доступ. Затым іх трэба было мадыфікаваць пад нашы прынтары – дзесьці зрабіць больш пластоў (каб фрагменты не адломваліся), дзесьці паскорыць друк, а дзесьці замарудзіць на праблемных участках – падганялі некалькі дзён».

У цэлым выраб адной накрыўкі займае 50 хвілін, а вось цяжэйшы адаптар друкуецца каля 2 гадзін. На адным працоўным стале прынтара можна размясціць 5 адаптараў ці 15 накрывак. Пасля тэсціравання студэнты паказалі выпрабавальныя вырабы медыкам, і тыя ўхвалілі іх якасць. Пасля гэтага наладзілася ўжо «серыйная» вытворчасць.

### Попыт расце

Пасля першага ўдалага вопыту хлопцы вырашылі прапанаваць сваю дапамогу іншым медустановам, размясцілі інфармацыю ў сацыяльныя сеткі, падключылі прэс-службы Міністэрства адукацыі і БДУ і выклікалі цэлы шквал водгукаў ад валанцёраў і медыкаў.

«Да нас пачалі паступаць заказы проста па сарафанным радыё, людзі ахвотна дзяліліся нашымі пастамі. Ёсць канал „Дапаможам медыкам“, дзе медыкі з усёй Беларусі робяць запыты, што ім трэба (рэспіратары, халаты, камусьці якраз накрыўкі). Мы апублікавалі там аб’яву, а мадэратару скінулі спіс усіх мадэляў, якія можам друкаваць. Неўзабаве нам прыйшоў заказ з той жа 10-й клінічнай бальніцы, але ўжо з аддзялення кардыялогіі, зараз удакладняем, чым можам дапамагчы 5-й бальніцы, а ўчора паставілі накрыўкі ў Крупскую ЦРБ (Мінская вобл.).

Акрамя таго, у Гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі мы таксама перадалі 100 накрывак, там жа нам сказалі, што маюць вялікую патрэбу ў адаптарах для снорклаў. Мы знайшлі гатовую трохмерную выяву і аддрукавалі першы ўзор. Медыкам ён падышоў, і мы вырабілі 20 штук (10 з іх у Ліцэі і 10 у БДУ). Сёння павязём іх заказчыкам, а новыя накрыўкі перададзім у Шклоўскую ЦРБ (Магілёўская вобл.).

Паралельна да нас таксама звярнуліся з РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі – ім патрэбныя для прамянёвай тэрапіі тонкія і дакладныя прыстасаванні. Паколькі яны павінны быць прыдатныя да стэрылізацыі пры высокіх тэмпературах, там і матэрыял павінен быць іншы. Нам шчыра сказалі, што калі зможам дапамагчы, то выратуем шмат жыццяў, – распавядае *Аляксандр Кузняцоў*. – Мы паабяцалі, што паспрабуем. Учора ўвечары я забраў у супрацоўніцы анкацэнтра прататып, а Яўген ужо штосьці змадэляваў, цяпер будзем правяраць».

### З чаго ж зроблены…

Зразумела, што для вырабу дэталяў на 3D-прынтары патрэбныя спецыяльныя матэрыялы. Першыя восем шпулек пластыкавых нітак хлопцам дапамог купіць студсаюз юрыдычнага факультэта на чале з Паўлам Захарчанкам са сродкаў, прадугледжаных на мерапрыемствы, якія былі адменены ў сувязі з неспрыяльным становішчам.

«Нам таксама абяцалі дапамогу ад прадстаўніцтва IBA. Большую частку з гэтых грошай мы, напэўна, пусцім на закуп пласцін з палімернага пластыку для вырабу медыцынскіх шчыткоў, таму што замовы сыплюцца літаральна кругласутачна ад шматлікіх медустаноў, якія ў іх зацікаўлены. Адміністрацыя БДУ ў асобе першага прарэктара *Дзмітрыя Георгіевіча Мядзведзева* прыкладае намаганні, каб абсталяваць для нас памяшканне з добрай вентыляцыяй. Мы таксама вядзём перамовы з MakeIt-цэнтрам наконт арэнды лазернага разака. Калі ў нас атрымаецца, то, паколькі на выраб шчыткоў трэба шмат лістоў палімернага пластыку, мы плануем адкрыць дабрачынны збор на пляцоўцы MolaMola.by», – запэўнівае *Аляксандр Кузняцоў*.

### Далучайцеся!

Калі студэнты пачнуць выраб шчыткоў, то яны збіраюцца пашырыць каманду і прыцягнуць у яе валанцёраў для дастаўкі гэтых вырабаў. На дадзеным жа этапе яны абыходзяцца сваімі сіламі і запрашаюць да супрацоўніцтва людзей і арганізацыі, у каго ёсць 3D-прынтары. Ініцыятары могуць прапанаваць ахвотнікам ужо гатовыя трохмерныя мадэлі, аптымізаваныя настройкі і расходныя матэрыялы. Абмяркоўваюць гэту магчымасць з іншымі ўніверсітэтамі, школамі і каледжамі. Прыемна, што ў БДУ знайшліся такія ініцыятыўныя і здольныя навучэнцы, з іх дапамогай наша грамадства абавязкова стане здаравейшым не толькі ў фізічным, але і маральным аспекце.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**







*Перадача адаптараў для снорклаў у Гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі*

# «Вытрымлівайце дыстанцыю»

## Як змяніўся адукацыйны працэс у БДУ

Зусім нядаўна стартаваў праект Студэнцкай асамблеі #НЕвопрос, у рамках якога пытанні студэнтаў задаюцца кіраўніцтву ўніверсітэта ў фармаце інтэрв'ю.


Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Студэнт 2 курса Інстытута бізнесу **Ягор АЛІФЕРКА** і студэнтка 3 курса факультэта журналістыкі **Рэвека АХРАМЕНКА** прыйшлі абмеркаваць цяперашнюю сітуацыю ў БДУ з прарэктарам па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях **Аксанай ЗДРОК.**

***– Наколькі змяніўся адукацыйны працэс ва ўніверсітэце ў сувязі з сітуацыяй у краіне?***

– Мы актыўна выкарыстоўваем інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі і электронныя сродкі навучання. Для студэнтаў нічога не памянялася. У артыкуле 17 Кодэкса аб адукацыі РБ напісана, што адукацыя можа атрымлівацца ў вочнай і завочнай форме. Вочная форма навучання – гэта асабісты ўдзел студэнта ў рэгулярных занятках, якія арганізоўвае ВНУ на пастаяннай аснове. Завочная форма мяркуе больш самастойнай працы. І тэрмін «дыстанцыйнае навучанне», які зацвердзіўся пад уплывам СМІ, не адпавядае таму, што ёсць насамрэч. Дыстанцыйная форма навучання – гэта разнавіднасць завочнай формы, калі заняткі праводзяцца рэдка і для выніковай атэстацыі, а большую частку часу студэнт вучыцца самастойна на адлегласці.

І калі паглядзець на наш працэс, то «вочнік» працягвае ўвесь час узаемадзейнічаць з выкладчыкам паводле раскладу з дапамогай тэхналогій, чым мы займаліся і раней.

У 2018 годзе была прынята стратэгія лічбавай трансфармацыі ВНУ паводле кодэкса, які прадугледжвае выкарыстанне сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій. У нашым пілотным праекце ўдзельнічалі некалькі факультэтаў, а пасля практыка была пашырана. Вопыт такіх заняткаў у выкладчыкаў ёсць, проста мы сталі гэта ўсё ажыццяўляць інтэнсіўней і маштабней.

***– Зараз БДУ перайшоў на часовае дыстанцыйнае навучанне, але ёсць лабараторныя і практычныя заняткі, якія немагчыма правесці ў анлайн-рэжыме. Ёсць студэнты, якія не могуць асвоіць прадмет дыстанцыйна і хочуць прыйсці ва ўніверсітэт. Атрымліваецца, што выкладчык праводзіць пару ў сябе дома, а навучэнец тым часам знаходзіцца ў аўдыторыі. Што рабіць у такой сітуацыі?***

– У нас няма поўнага пераходу на дыстанцыйнае навучанне. Ёсць правядзенне некаторых заняткаў у аддаленым фармаце. Такія змены ў адукацыйным працэсе былі зроблены па запытах, якія паступалі ў рэктарат. Мы паглядзелі, што наведвальнасць студэнтаў зменшылася на 30 %, і папрасілі выкладчыкаў загрузіць усе матэрыялы на электронны рэсурс.

Рэктар прыняў загад па пашырэнні захадаў дыстанцыявання выкладчыкаў і студэнтаў паміж сабой, што дазваляе вучыцца і працаваць адначасова. Гэтай магчымасцю скарысталіся далёка не ўсе. Напрыклад, у МДЭІ імя А. Д. Сахарава толькі 70 з 200 выкладчыкаў напісалі заяву для пераходу на дыстанцыйную працу, у адпаведнасці з палажэннямі Працоўнага кодэкса РБ.

Лабараторныя і практычныя заняткі будуць і далей праводзіцца ў аўдыторыі, але для гарантыі бяспекі мы выбіраем шырэйшыя аўдыторыі і забяспечваем адлегласць 1,5–2 метры паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу.

Нашы карпусы, камп'ютарныя класы і месцы агульнага карыстання адчынены для ўсіх студэнтаў, у якіх няма магчымасці займацца дома. Мы імкнёмся мінімізаваць прамыя кантакты паміж студэнтамі і выкладчыкамі. Але нельга адразу перавесці ўсе заняткі ў анлайн-рэжым.

***– Ці плануецца перагляд платы за навучанне ў сувязі са зменай формы правядзення некаторых заняткаў?***

– Не плануецца, таму што ў адукацыйным працэсе нічога не змянілася. Засталася вочная форма навучання, заняткі праводзяцца паводле раскладу, забяспечана ўзаемадзеянне выкладчыка са студэнтамі на пастаяннай аснове. Студэнты вучацца гэтак жа, як і раней, проста памянялася форма правядзення заняткаў.

Трэба разумець, што працэс пераходу на сучасныя тэхналогіі патрабуе шмат затрат. Нагрузка павялічылася ў 2–3 разы, але выкладчыкі, тым не менш, не ставяць пытанне пра павышэнне зарплаты. Усе працуюць вельмі інтэнсіўна, для правядзення заняткаў у дыстанцыйным рэжыме неабходна вялікая падрыхтоўка.

***– Пытанне, якое хвалюе многіх студэнтаў: што будзе з сесіяй? І ці ёсць у адміністрацыі варыянты правядзення атэстацыі?***

– Магчыма, да лета адбудзецца спад захворвання. Мы прапрацоўваем мноства варыянтаў і бліжэй да сесіі ўжо вызначымся. Пакуль дыстанцыйнае навучанне працягнецца да 31 мая.

Мы аналізавалі досвед нашых і замежных універсітэтаў, каб паглядзець, як праводзіцца атэстацыя ў анлайн-рэжыме. Таму, калі паўстане неабходнасць у прымяненні такога варыянту, уся інфармацыя будзе даведзена да выкладчыкаў і студэнтаў.

***– Якія меры ва ўніверсітэце прымаюцца для бяспекі студэнтаў і выкладчыкаў? Як адміністрацыя рэагуе на зваротную сувязь?***

– На мой погляд, у БДУ прымаецца дастатковы комплекс мер бяспекі, якія змяняюцца і дапаўняюцца новымі ў залежнасці ад сітуацыі.

На першапачатковым этапе праводзілася інфармаванне пра тое, што трэба выконваць правілы асабістай гігіены і сацыяльнага дыстанцыявання. Таксама была забяспечана апрацоўка памяшканняў і павешаны санітайзеры ў месцах агульнага карыстання. Мы перанеслі паточныя лекцыі і рэкамендавалі дэканатам праводзіць заняткі групы ў межах адной аўдыторыі. Усе меры прымаюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі, якія мы атрымліваем ад міністэрстваў аховы здароўя і адукацыі, а таксама санэпідстанцыі і Мінгарвыканкама.

Але кожны выкладчык і студэнт нясе адказнасць за ўласнае здароўе. Нездарма перад выхаднымі рэктар А. Д. Кароль папрасіў студэнтаў не раз'язджацца, заставацца ў інтэрнатах і ў месцах пастаяннага пражывання. Таксама ў ВНУ перанесены масавыя спартыўныя і культурныя мерапрыемствы. Таму хачу яшчэ раз звярнуцца да ўсіх з просьбай выконваць правілы асабістай гігіены і клапаціцца адзін пра аднаго.

***– Са з'яўленнем дыстанцыйнага навучання стала значна больш хатніх заданняў, і ўсё гэта патрабуе інтэрнэт-рэсурсаў. Напрыклад, прагляд відэаматэрыялаў і рашэнне анлайн-тэстаў. Асабліва з такімі цяжкасцямі сутыкнуліся студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах. Ці ёсць нейкія крытэрыі таго, колькі хатніх заданняў павінен даваць выкладчык? І як будзе вырашацца сітуацыя з інтэрнэтам у інтэрнатах?***

– Кожны студэнт павінен разумець, што доля самастойных заданняў павялічылася яшчэ задоўга да сітуацыі з вірусам. Калі традыцыйныя формы навучання прадугледжвалі, што навучэнец займае пасіўную пазіцыю і на занятках успрымае гатовую інфармацыю ад выкладчыка, то сучасная сістэма адукацыі патрабуе большай долі самастойнасці. Па сутнасці, студэнт павінен прыйсці на лекцыі і семінарскія заняткі, загадзя прапрацаваўшы матэрыял.

Адукацыя на сёння арыентавана на падрыхтоўку спецыялістаў, якія змогуць творча вырашаць любую праблему ў сітуацыі нявызначанасці. Веды старэюць вельмі хутка, і ўзнікаюць новыя задачы, таму студэнт павінен выйсці з наборам такіх навыкаў, як камунікабельнасць, самаарганізацыя і ўменне крытычна думаць. І ў адпаведнасці з гэтым фарміруюцца творчыя заданні, якія не вырашыш за 1 гадзіну 20 хвілін, яны патрабуюць шмат часу. У будучыні будзе яшчэ больш самастойнай працы. Што да выкладчыкаў, то яны павінны ўлічваць загружанасць студэнтаў, але выразнага крытэрыю для хатніх заданняў няма.

Я добра разумею, што на студэнтаў у інтэрнатах лягла вялікая фінансавая нагрузка, каб забяспечыць побыт і харчаванне. Таму ўсім будзе дадзены бясплатны інтэрнэт для таго, каб паўнавартасна завяршыць адукацыйны працэс.

**Гутарыла**
**Рэвека АХРАМЕНКА**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, міжнародных адносін, інфармацыйных сістэм кіравання;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, германскіх моў, англійскага мовазнаўства, прыкладной лінгвістыкі, вылічальнай матэматыкі, тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскага мовазнаўства, кітайскай філалогіі, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.*

**ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: бізнес-адміністравання; міжнароднага бізнесу.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: кіравання фінансамі і маёмасцю (2); эканомікі і менеджменту; лагістыкі.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: кафедры прававых і гуманітарных дысцыплін (2); маркетынгу; лічбавых сістэм і тэхналогій.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, тэл. 306-00-27, 306-00-28, e-mail: sbmt@sbmt.by, mail@sbmt.by; http://www.sbmt.by.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Студэнты-ядзершчыкі БДУ будуць навучацца на віртуальным трэнажоры Atomic Keeper Education** – БелТА, sb.by, zviazda.by, «Мінск-Навіны», grodnonews.by, «Альфа Радыё» (07.04), «Настаўніцкая газета» (11.04), «Рэспубліка» (23.04).

**У БДУ выпускаецца кампанент з антысептычным дзеяннем «Міраміл»** – БелТА, sb.by, zviazda.by, «Мінск-Навіны», grodnonews.by, yandex.by (21.04), aif.by (22.04), tvr.by, «Спадарожнік» (29.04).

**Запуск віртуальнага 3D-тура ў БДУ** – БелТА, zviazda.by, onliner.by (22.04), radiomir.by, vdobrushe.by (23.04).

**Навуковая канферэнцыя да 75-годдзя Вялікай Перамогі ў рэжыме анлайн у БДУ** – zviazda.by, edu.gov.by (22.04), БелТА, «Мінск-Навіны», yandex.by (23.04).

**Спадарожнік БДУ больш за 500 дзён паспяхова працуе на арбіце** – БелТА, sb.by, zviazda.by (11.04).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

Універсітэт
18 мая 2020 года, № 8 (2230)

# Героі вайны ў нашых

Вялікая Айчынная вайна доўжылася амаль чатыры гады і стала самым буйным узброеным сутыкненнем у гісторыі чалавецтва. Наш народ змагаўся за свабоду і незалежнасць Радзімы. Дарагой цаной дасталася Перамога. Чаму важна памятаць пра вайну, расказалі тыя, чые родныя ваявалі на фронце.



*Аляксандр Храбтовіч, начальнік штаба грамадзянскай абароны БДУ*



*Валерый Губін, прафесар кафедры рэгіянальнай геалогіі ФГГ БДУ*



*Мая Сянько, намеснік дырэктара па новых тэхналогіях фундаментальнай бібліятэкі*



*Раман Зінчанка, студэнт 1 курса гістарычнага факультэта*





**Іван Герасімавіч Храбтовіч**

**Снайпер, камандзір кулямётнага аддзялення, зброевы майстар. «Практычна ўсю вайну прайшоў на перадавой. У яго былі залатыя рукі. Правёў рамонт дзвюх гармат пад моцным агнём саперніка».**

**Аляксандр ХРАБТОВІЧ**:

– У дзяцінстве з велізарнай цікавасцю слухаў аповеды бацькі пра вайну. Хоць ён узгадваў той час неахвотна, толькі некаторыя эпізоды, калі зрэдку збіраліся з ветэранамі дома на святы, успаміналі загінулых сяброў, гаварылі пра Вялікую Перамогу.

Мой бацька Іван Герасімавіч Храбтовіч нарадзіўся 26 чэрвеня 1913 г. у Магілёве. Праходзіў службу ў Чырвонай арміі з 1935 г. У наступным годзе прайшоў ваенныя курсы камандзіраў-майстроў баявой тэхнікі. У 1939–1940 гг. удзельнічаў у вайне з Фінляндыяй, там жа атрымаў снайперскае хрышчэнне. Было таксама ўз’яднанне заходніх і ўсходніх земляў Беларусі. Пасля звальнення з Чырвонай арміі паступіў у Магілёўскі педагагічны інстытут. «Усяго толькі паўгода пажылі мірным жыццём», – са шкадаваннем распавядаў ён.

23 чэрвеня 1941 г. бацька быў ізноў прызваны ў войска, на той момант яму было 28 гадоў. З 15 кастрычніка 1941 г. браў удзел у баях ВАВ на пасадзе камандзіра кулямётнага аддзялення стралковай роты 487 стралковага палка 143 стралковай дывізіі Бранскага фронту. У верасні 1942 г., у адпаведнасці з загадам камандзіра дывізіі па актывізацыі снайперскага руху, перад строем бацьку была ўручана снайперская вінтоўка. Ён амаль год служыў снайперам.

У яго былі залатыя рукі, мог усё паправіць. Пазней яго паставілі на рамонт зброі, бацька стаў зброевым майстрам дывізіі. У новай якасці ўжо ўдзельнічаў у баях на Курскай дузе ў 1943 г. Практычна ўсю вайну прайшоў на перадавой. Удзельнічаў у абароне Масквы, а канец вайны сустрэў пад Кёнігсбергам (Калінінградам) у маі 45-га. За час ВАВ тройчы быў паранены, адзін раз кантужаны.

Пра подзвігі бацькі гавораць яго ўзнагароды. Быў прадстаўлены да ордэна Чырвонай Зоркі ў 1942 г., у выпісцы з загада адзначаецца: «Тав. Храбтовіч у баях з нямецкімі фашыстамі праявіў сябе смелым валявым камандзірам». А яшчэ ў гэтым жа годзе «за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце і выяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць» атрымаў медаль «За баявыя заслугі». За праяўленне ў баі 4 лютага 1943 г. за в. Нова-Фёдараўка і Васіль-Тамашоўка ўзнагароджаны медалём «За адвагу». Выпіска з загада 251 ст. палка 85 ст. дывізіі 2 Прыбалтыйскага фронту: «Узнагароджваецца медалём «За адвагу» зброевы майстар гвардыі старшы сяржант Храбтовіч І. Г. за тое, што ён 16 жніўня 1944 г. у раёне в. Олі Латвійскай ССР правёў рамонт дзвюх гармат пад моцным агнём саперніка, тым самым даў магчымасць адбіць дзве контратакі ворага».

Пасля перамогі над фашысцкай Германіяй разам з іншымі салдатамі эшалонам быў накіраваны на Далёкі Усход. Але, даехаўшы да Байкала, яны даведаліся, што Японія капітулявала. У лістападзе 1945 года ён дэмабілізаваўся і вярнуўся ў Магілёў. Бацька ўсё ж скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Працаваў на розных пасадах у рэдакцыі газеты Магілёва, настаўнікам у школах вобласці (Угольшчына, Свацілавічы, Бялынічы). Браў удзел у розных мерапрыемствах па навучанні і выхаванні моладзі. Пра гэта гавораць пажоўклыя з гадамі фатаграфіі, дыпломы, граматы і падзякі. Навыкі трапнага стралка захаваліся і ў мірны час. На Другіх рэспубліканскіх стралкова-снайперскіх спаборніцтвах ДТСАРМ БССР у чэрвені 1949 г. ён заняў першае месца і быў узнагароджаны дыпломам першай ступені.

Я дзень 9 Мая лічу святым. Героі вайны прынеслі нам волю і незалежнасць. Я ганаруся сваім бацькам. Памяць пра яго будзе жыць вечна. Ён ваяваў за Радзіму ў пякельных умовах: і ў спякотнае лета, і ў дажджлівую восень, і ў халодную зіму. Бацька выхаваў мяне патрыётам, вучыў не браць чужога, любіць сваю краіну і заставацца заўсёды чалавекам. У нашай сям’і захавалася адданасць ваеннай справе. Я скончыў ваенную службу ў вайсковым званні палкоўніка, сын таксама ваенны – падпалкоўнік. А ўнук названы ў гонар майго бацькі, свайго прадзеда, Іванам. Цяпер ён другакласнік і таксама хоча працягнуць ваенную дынастыю.





**Мікалай Лявонцьевіч Губіна**

**Лётчык-знішчальнік. «Кулі прайшлі зусім побач, але, на шчасце, не зачапілі бацьку. Штурмавікі пры яго суправаджэнні не мелі страт».**

**Валерый ГУБІН:**

– Дарагі мой бацька, Мікалай Лявонцьевіч Губіна, у 20-гадовым узросце быў малодшым лейтэнантам, лётчыкам 152-га гвардзейскага знішчальнага авіяцыйнага Сандамірскага ордэна Багдана Хмяльніцкага палка, які ўваходзіў у склад 12-й гвардзейскай знішчальнай авіяцыйнай Знаменскай Чырванасцяжнай дывізіі 1-га Украінскага фронту.

З верасня 1944 г. бацька знаходзіўся ў дзеючым войску і браў удзел у некалькіх буйных аперацыях Вялікай Айчыннай вайны. Штурмавікі, якія прыкрываў лётчык-знішчальнік Мікалай Губіна, наносілі магутныя ўдары па войсках суперніка.

Бацька рэдка распавядаў мне пра паветраныя баі на вайне. Прайшоў час, і я ўбачыў яго ўзнагародны ліст, у адпаведнасці з якім ён прадстаўляўся да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі. У гэтым дакуменце, падпісаным камандзірам палка гвардыі маёрам Васілём Шаўчуком, напісана наступнае: «...За перыяд баявых дзеянняў па пашырэнні плацдарму ў нямецкай Сілезіі і ліквідацыі акружанай групіроўкі суперніка ў раёне Опельн з 1 студзеня па 17 красавіка 1945 г. Мікалай Губіна ажыццявіў 30 паспяховых вылетаў на суправаджэнне штурмавікоў. Правёў шэсць паветраных баёў і восем самастойных штурмовак. У паветраных баях паводзіць сябе смела і дзейнічае рашуча, надзейна прыкрывае штурмавікоў ад нападаў знішчальнікаў суперніка. Не было выпадкаў невыканання баявога задання, а штурмавікі пры яго суправаджэнні не мелі страт ад знішчальнай авіяцыі суперніка».

З нешматлікіх аповедаў бацькі пра баявыя дзеянні мне запомніўся адзін эпізод. У сакавіку 1945 г. ён у складзе групы знішчальнікаў Як-3 вылецеў на прыкрыццё штурмавікоў Іл-2, якія атрымалі заданне атакаваць танкі суперніка. Пры падыходзе да лініі фронту да штурмавікоў з-за аблокаў нечакана наблізілася група нямецкіх знішчальнікаў Ме-109 і паспрабавала атакаваць іх. Але напады немцаў былі адбіты некалькімі парамі «якаў». Прайшоў некаторы час, і «месеры» раптам з’явіліся зноў. Мой бацька, каб пагладзець на штурмавікі, якія ён прыкрываў, рэзка нахіліў галаву да бака-
віцы ліхтара. Тым часам
га прабіла кабіну самал
зусім побач, але, на шч
бацьку. Ён ізноў ата
закрываючы штурмавік
раным баі група штурм
нікі, якія іх прыкрывалі,

Мікалай Лявонцьеві
дана і бясстрашна ўдз
раных баях. За выдатна
вых заданняў у перыяд
вайны быў узнагарод
Чырвонай Зоркі і Айчын
лямі «За баявыя заслуг
не Прагі», «За ўзяцце Бе
могу над Германіяй у В
вайне 1941–1945 гг.».

Пасля вайны гвардз
нант Мікалай Губіна пра
ваенна-паветраных сіла
гілёве, потым ужо ў зв
мандаваў авіяцыйнай
Бабруйску, а затым у
Ваўкавыскага раёна.
тыўных самалётах МіГ.
званне маёра і быў на
лейшага праходжання
чатку, у горад Ялізава.

У 1960 г. ваенны лёт
лай Губіна ва ўзросц
звольнены ў сувязі са
броеных Сіл па ўказанн
Разам з сям’ёй пераеха
ючыся лётчыкам у душ
да інжынернага асярод
прыборабудаўнічым за
ніна. За плённую выт
скую дзейнасць быў уз
дэнам Кастрычніцкай
лём «За шматгадовую
працу». Бацька перада
данасць да авіяцыі. У п
я займаўся ў Мінскім аэ
і ў 16 гадоў ажыццявіў с
стойны палёт на планё
авіяцыяй і геалогіяй я
гады з’явілася пачаткам
барам жыццёвага шлях
ня зямных нетраў мета
нага зандзіравання Зям
касмічных апаратаў. Су
мі і геолагамі я браў у
аэравізуальных назіра
аб’ектаў з борта верта
бліва ў цяжкадаступн
раёнах паўднёвай частк

Я вельмі ганаруся св
важным лётчыкам, удз
Айчыннай вайны, аб
Радзімы.

# сем'ях. Успаміны



и кулямётная чар-
іёта. Кулі прайшлі
насце, не зачапілі
каваў суперніка,
кі. У гэтым павет-
авікоў і знішчаль-
страт не мелі.
ч Губіна самаад-
ельнічаў у павет-
ке выкананне бая-
Вялікай Айчыннай
джаны ордэнамі
най вайны, меда-
і», «За вызвален-
ерліна», «За пера-
Вялікай Айчыннай

ы старшы лейтэ-
ацягваў служыць у
ах. Спачатку ў Ма-
ванні капітана ка-
эскадрылляй у
у мястэчку Рось
Лётаў на рэак-
У 1958 г. атрымаў
кіраваны для да-
службы на Кам-

чык 1 класа Міка-
е 37 гадоў быў
скарачэннем Уз-
і М. С. Хрушчова.
аў у Мінск. Заста-
ы, ён адаптаваўся
дзя. Працаваў на
водзе імя У. І. Ле-
ворчую і грамад-
нагароджаны ор-
эвалюцыі і меда-
добрасумленную
аў мне любоў і ад-
ерыяд юнацкасці
раклубе ДТСААФ
свой першы сама-
ы. Захопленасць
шчэ ў школьныя
і правільным вы-
у ў галіне пазнан-
дамі дыстанцый-
млі з авіяцыйных і
месна з лётчыка-
дзел у выкананні
нняў геалагічных
алёта Ка-26, аса-
ых забалочаных
кі Беларусі.
аім бацькам – ад-
ельнікам Вялікай
аронцам нашай





Уладзімір Іванавіч Сянько

## Кулямётчык пяхоты. «Лічыў, што быў загавораны ад куль. Подзвіг майго бацькі выратаваў усю яго сям'ю».

**Мая СЯНЬКО:**

– Думаю, мой бацька Уладзімір Іванавіч Сянько паўтарыў шлях многіх 18-гадовых юнакоў Заходняй Беларусі. Ён нарадзіўся 1 красавіка 1926 г. на хутары недалёка ад вёскі Задворцы Вілейскага павета (пасля вайны ён стаў Маладзечанскім). У армію пайшоў добраахвотнікам у 18 гадоў разам з усімі старэйшымі мужчынамі сям'і. Гэта здарылася ўлетку 1944 года, у дзень вызвалення роднай сялібы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Такое рашэнне тлумачыцца шэрагам прычын. З аднаго боку, яны хацелі ваяваць у Чырвонай арміі. А з іншага боку, ён быў з сям'і раскулачаных, трэба было быць на галаву вышэй за астатніх, каб прыжыцца ў новым грамадстве.

Як шмат каго з беларускіх юнакоў, яго адправілі ў пяхоту. Бацька хацеў быць кулямётчыкам, таму што яму падабалася вялікая зброя. Вядома, пазней ён зразумеў, што ў рэчаіснасці гэта было месца смяротніка. Служыў кулямётчыкам у 138 стралковым палку 48 стралковай дывізіі 3 Беларускага і 1 Украінскага франтоў. Ваяваў пад Кёнігсбергам і Берлінам. Фактычна ў баявым войску ён прабыў паўгода, за гэты час быў тройчы паранены.

Ён быў чалавекам надзвычай смелым і адважным. Лічыў, што быў загавораны ад куль. Распавядаў, што чуў, як яны свішчуць, і таму дакладна ведаў, куды яму трэба павярнуцца, каб ад іх ухіліцца. Першы баявы медаль «За адвагу» атрымаў у сакавіку 1945 г. А ўжо ў красавіку на подступах да Берліна ён у 19 гадоў быў ганараваны ордэнам Славы 3 ступені.

У нашай сям'і мы мала гаварылі пра вайну. Мне запомнілася гісторыя яго знаходжання ў шпіталі. Яму толькі споўнілася 19 гадоў, ішлі цяжкія баі за Берлін. У той дзень было вельмі шмат параненых (верагодна, што ў іншыя дні таксама). Нікога не аперавалі, а толькі праводзілі ампутацыі. Але ён быў такі малады і прыгожы, што яго пашкадавалі і адзінага прааперавалі. Аднак усё адно ў яго засталася інваліднасць. Гэта было не дужа прыкметна, але для страявой службы ён быў ужо непрыгодны. Пасля дэмабілізацыі ў 1949 г. ён вярнуўся на радзіму, уладкаваўся каморнікам. Па яго словах, пасляваенныя гады таксама выдаліся няпростымі і не заўсёды мірнымі.

Подзвіг майго бацькі выратаваў усю сям'ю. Да раскулачаных было асаблівае стаўленне, яны былі абмежаваны ў шматлікіх правах. Але яго заслугі і ўзнагароды дазволілі яму і родным пражыць годнае жыццё.

У дзяцінстве пасля прагляду фільма «Беларускі вакзал» я пытала бацьку пра яго аднапалчан, чаму ён, як у кіно, ні з кім не сустракаўся 9 мая. Тады ён адказваў: «Якія могуць быць аднапалчане ў пяхоты?» Не аднойчы ён адзін заставаўся ў жывых з усяго ўзвода.

Мне здаецца, што на фронце ён застаўся назаўжды. У канцы сваіх дзён ён усё часцей успамінаў вайну, усё больш яму балелі раны. І не толькі душэўныя – яго пачалі трывожыць непрааперыраваныя аскепкі. Вайна стала галоўным у яго жыцці. Астатняе ўжо не мела той цаны, якую ён заплаціў на фронце. Не было і перамог, параўнальных з вызваленнем Радзімы.

Для мяне 9 Мая самае галоўнае свята, але і самае сумнае. Я ўспамінаю бацьку, сваякоў, якія ваявалі на вайне і якія не ваявалі, але пражылі яе па-чалавечы. Ганаруся іх подзвігам. Я доўгі час жыла побач з сапраўднымі героямі!

Што да бібліятэкі БДУ, то кожны год мы праводзім розныя мерапрыемствы, прысвечаныя гадавіне Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сёлета мы абмежаваліся выставачнай працай у чытальных залах і анлайн. У анлайн-прэзентацыі «Памяць бацькаў і дзедаў» мы сабралі некаторыя матэрыялы і фатаграфіі сваякоў супрацоўнікаў бібліятэкі, якія ваявалі на фронце. У віртуальнай выставе «Кнігі ваенных гадоў» распавядаем пра невялікую частку асобнікаў, якія захоўваем, яны стваралісь ў неверагодных умовах і адразу ж сыходзілі на фронт, пра кнігі-самаробкі, пра кнігі, якія выдаваліся ў блакадным Ленінградзе. Да 75-годдзя Перамогі мы падрыхтавалі экскурсію ў рэжыме анлайн па фондзе рэдкіх і каштоўных выданняў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ «Наша памяць без тэрміну даўнасці». Падчас экскурсіі ёсць магчымасць пазнаёміцца з кнігамі, выдадзенымі ў перыяд з 1941 па 1945 гады, якія беражліва захоўваюцца ў фондзе ФБ (140 асобнікаў).





Дзмітрый Фёдаравіч Чупрыс

## Кіраўнік разведвальна-дыверсійнай партызанскай групы. «Асабіста пусціў пад адхон 7 эшалонаў ворага; удзельнічаў у стварэнні плана па замаху на гаўляйтара Беларусі В. Кубэ».

**Раман ЗІНЧАНКА:**

– У маёй сям'і з родных ваявалі 4 чалавекі. Па дзедавай лініі яго маці і дзядзька, а па бабулінай лініі – два яе дзядзькі. Асобна хачу распавесці пра дзядзьку майго дзядулі. Яго імя Дзмітрый Фёдаравіч Чупрыс, ён нарадзіўся ў 1910 г. у вёсцы Барыскі Лагойскага раёна Мінскай вобласці. У 1934 г. скончыў Аб'яднаную беларускую ваенную школу імя Калініна ў Мінску. Прайшоў дзве вайны: савецка-фінскую і Вялікую Айчынную.

З першых дзён чэрвеня 1941 года Дзмітрый Фёдаравіч ваяваў на фронце. У баі ў раёне Дзяржынска ў складзе часткі патрапіў у акружэнне. Калі з вялікімі стратамі атрымалася выйсці з акружэння, арганізаваў партызанскую групу, з якой у ліпені 1942 г. уліўся ў склад партызанскага атрада «Штурм». З 1942 па 1944 гады ён выконваў заданні Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генеральнага штаба Чырвонай арміі ў тыле нямецка-фашысцкіх войскаў на тэрыторыі Беларусі. Дзмітрый Фёдаравіч як кіраўнік групы разведвальна-дыверсійнага партызанскага атрада «Дзіма» арганізаваў і ўзначальваў агентурную разведку і дыверсійную працу ў Мінску, Мінскай, Маладзечанскай і Баранавіцкай абласцях. Удзельнічаў у шматлікіх аперацыях, у тым ліку ў рэйкавай вайне. Асабіста пусціў пад адхон 7 эшалонаў ворага. Як начальнік партызанскага атрада «Дзіма» ўдзельнічаў у стварэнні плана па замаху на гаўляйтара Беларусі Вільгельма Кубэ.

Пасля вызвалення беларускай зямлі працягнуў службу ў дзеючым войску. Ваяваў на 1-м, 2-м і 3-м Беларускіх франтах. Удзельнічаў у штурме Кёнігсберга. Пад горадам Хайлігенбайль (цяпер Мамонава) быў паранены ў нагу. Пасля Перамогі служыў у Савецкай арміі да 1953 г. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені, «За перамогу над Германіяй», «За ўзяцце Кёнігсберга» і шэрагам іншых. Памёр у 1970 годзе.

На маю думку, трэба памятаць пра тыя грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны для таго, каб не дапусціць падобнага ў будучыні. Неабходна актыўна вывучаць гісторыю, захоўваць памяць пра вайну, перадаваць веды па гэтай тэме іншым. Не дапускаць перапісвання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а ўстаць на абарону нашай Перамогі.

За чатыры гады я запісаў больш за 100 успамінаў удзельнікаў вайны, якія жывуць галоўным чынам у Мінску і Мінскай вобласці. Для захавання памяці тры гады назад запусціў у інтэрнеце праект «Вялікай Радзімы сыны!». Тут публікую ўспаміны ветэранаў: удзельнікаў ВАВ, работнікаў тылу і блакаднікаў Ленінграда.

Вядома, разгаварыць ветэранаў на тэму франтавых гадоў не заўсёды бывае лёгка. Так, яны могуць распавесці агульную інфармацыю з гісторыі, але не хочуць глыбока пранікаць у свой лёс. Баляць раны. Яны бачылі смерць блізкіх і таварышаў, неймаверныя пакуты і жахі, таму, варушачы мінулае, людзі такога старэчага ўзросту пачуваюцца нядобра, у іх наварочваюцца на вачах слёзы, а пасля сустрэчы іх доўга не пакідаюць гэтыя ўспаміны. Але ёсць і тыя ветэраны, якія любяць узгадваць вясёлыя моманты франтавога жыцця – так, былі і такія.

Цяпер сярэдні ўзрост ветэранаў, з якімі я размаўляю, 95–96 гадоў, а некаторым і больш за стагоддзе, найстарэйшаму ў снежні будзе 105. Шмат каго адольваюць слабасць і хваробы, але яны імкнуцца трымацца бадзёра, бо яны людзі пакалення першай паловы 20-га стагоддзя, загартаваныя ў працы і бітвах.

Збіраючы аповеды ветэранаў, я прыйшоў да такой высновы: трэба як мага хутчэй перадаць каштоўныя ўспаміны маладому пакаленню, каб яны ведалі, праз што прайшлі іх продкі. Што яшчэ ёсць людзі, якія ваявалі за нашу мірную будучыню на фронце і ў партызанах, працавалі ў тыле. Каб пастараліся з імі сустрэцца, падтрымаць не толькі справай, але і проста добрым словам. Бо сведкаў тых падзей становіцца ўсё менш.

**Збірала ўспаміны Алена ЛЯЎШЭНЯ**

Універсітэт
18 мая 2020 года, № 8 (2230)

# Стартап-школа «СІТА»

## Як студэнтам дапамагаюць стварыць уласны бізнес

**Увосень мінулага года ў БДУ зарабіў уласны Startup Hub – цэнтр развіцця маладзевага прадпрымальніцтва нашага ўніверсітэта. Тут студэнтам дапамагаюць пачаць свой бізнес, увасабляючы ў жыццё ідэі самых смелых праектаў. З гэтай мэтай працуе стартап-школа, у якой навучаецца ўжо другі набор студэнтаў.**

### Першыя выпускнікі стартап-школы

Школа «СІТА» пачала працаваць 1 кастрычніка 2019 года. На працягу двух месяцаў вядучыя спецыялісты-практыкі ў галіне бізнесу і прадпрымальніцтва дзяліліся з удзельнікамі вопытам і распавядалі пра важныя этапы, якія неабходна прайсці стартапу ад з'яўлення бізнес-ідэі да пошуку інвестыцый для праекта. А ў канцы лістапада ўдзельнікі першага набору абаранілі свае бізнес-праекты. Вытрымалі тэмп навучання і ўмацавалі жаданне працаваць дзеля ўласнай справы не ўсе: з чатырнаццаці ўдзельнікаў выпусціліся восем.

– Мы часта чуем: «Бізнес-адукацыя не працуе», – адзначае кіраўнік стартап-школы «СІТА» **Хрысціна КАНАНОВІЧ** і тлумачыць: – Любая адукацыя сама па сабе не працуе. Падручнікі, вэбінары, курсы, асабістыя суправаджэнні – гэта ўсё пустое марнаванне часу, калі не працуюць вучні. Самы запатрабаваны і дарагі курс будзе бескарысным, калі не выйсці з зоны камфорту і не пачаць дзейнічаць.

Нашай задачай было і застаецца знаходзіць людзей, сапраўды зацікаўленых у стварэнні ўласнага бізнесу. Важна, каб навучэнцы гарэлі ідэяй распрацаваць унікальны прадукт, былі гатовыя прымаць рашэнні і несці за іх адказнасць. Мэта стартап-школы заключаецца не ў тым, каб пабудаваць бізнес за ўдзельнікаў «СІТА», а ў тым, каб дапамагчы ім зрабіць першыя крокі на шляху ад з'яўлення ідэі да стварэння паўнавартаснага бізнесу.

Свае заслужаныя сертыфікаты пра заканчэнне навучання ў стартап-школе атрымалі наступныя праекты: Fresh Bar BSU, Cleaning BSU, «Віртуозы навукі БДУ», «Школа рэдактараў», «Эксклюзіўныя падарункі», «Каворкінг для дызайнераў», «Карпаратыўная кавярня БДУ», «Дызайн скураных вырабаў». Як адзначаюць у Стартап-цэнтры, сёння актыўна развіваюцца тры з васьмі праектаў: Fresh Bar BSU гатовы да адкрыцця і чакае спрыяльнага эпідэміялагічнага становішча; «Карпаратыўная кавярня БДУ» знайшла інвестараў і знаходзіцца на ўзгадненні праекта, а вось Cleaning BSU ужо прыняў і выканаў замовы першых кліентаў.

– Мы займаемся ўборкай у інтэрнатах, робім жыццё студэнтаў камфортным, – распавядае кіраўнік Cleaning BSU **Дыяна КАВАЛЁВА**. – Навучанне ў стартап-школе скончылася, мы ўжо запусціліся і правялі нашы першыя ўборкі, але важна, што Стартап-цэнтр працягвае аказваць ментарскую падтрымку. Даюць парады і кансультуюць па любых пытаннях, з якімі я сутыкаюся ў сваёй дзейнасці: ад дзелавой перапіскі і правільнага афармлення лістоў да заявак да пытанняў, звязаных з арэндай.

### «СІТА 2.0»

– У снежні 2019 года мы правялі конкурс інавацыйных праектаў у сферы вынікаў навуковай дзейнасці – INNSTART-BSU. Для конкурсу адабралі праекты, якія ўяўлялі сабой вынік навуковай дзейнасці, а таксама мелі камерцыйны патэнцыял. Удзельнікі прэзентавалі праекты інвестыцыйнай і бізнес-супольнасці, зацікаўленай або ў куплі (арэндзе) інтэлектуальнай уласнасці, або ў інвеставанні ў сумесныя прадпрыемствы. Конкурс паказаў, што велізарную ролю ў развіцці стартап-руху іграюць не толькі традыцыйныя бізнес-праекты, але і венчурныя праекты інавацыйнай дзейнасці, якія паказалі сваю актуальнасць сярод навучэнцаў, напрыклад, «Насімая электроніка EL-Sense» і D3D Mini (кампактны 3D-прынтар). Зрабіўшы выснову з гэтага вопыту, мы вырашылі арыентаваць «СІТА 2.0» на адбор праектаў з венчурнай гісторыяй, гэта значыць шукаць у першую чаргу інавацыйныя праекты з высокай рызыкай і патэнцыйнай магчымасцю хуткага маштабавання, – тлумачыць Хрысціна Кананові̇ч.

Бізнес нараджаецца з ідэі, для рэалізацыі якой неабходная каманда ініцыятыўных людзей у розных сферах дзейнасці, іх сумеснымі высілкамі рэалізуецца бізнес-праект, таму шукаць і адбіраць удзельнікаў у другі сезон стартап-школы вырашылі пасродкам хакатону. У сакавіку Стартап-цэнтр правёў 15-гадзінны марафон HACKATHON: FROM IPT TO IPO – форум для студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, маладых навукоўцаў БДУ.

На мерапрыемстве ўдзельнікі з ідэямі праектаў аб'ядналіся ў каманды са спецыялістамі з розных галін: юрыстамі, эканамістамі, праграмістамі, дызайнерамі, менеджарамі, каб у адведзены тэрмін распрацаваць уласны ўнікальны прадукт. Каманды вывучалі рынак, аналагі сваіх ідэй, спрабавалі будаваць бізнес-мадэль і прэзентавалі праекты экспертам. Акрамя таго, удзельнікі ў рамках хакатону прайшлі два неабходныя для прадпрымальнікаў-пачаткоўцаў трэнінгі: «Метадалогія. Фарміраванне гіпотэзы. Методыка працы з гіпотэзамі» і «Бізнес-мадэль. Вызначэнне бізнес-мадэлі. Распрацоўка і прымяненне, яе пабудова». Пасля кожнага майстар-класа каманды выконвалі заданні для ацэнкі перспектыўнасці бізнес-ідэі і развіцця праекта.

Фіналістамі хакатону, а таксама ўдзельнікамі «СІТА 2.0», сталі наступныя праекты: SURDO ADAPTER – прыкладанне для пераводу галасавых каманд у анімацыю мовы жэстаў; School Space Project – распрацоўка праграмнага забеспячэння мадэлявання руху касмічных аб'ектаў у калязямной прасторы і блізкім космасе; мабільнае прыкладанне для выгулу сабак «Пагуляйка»; мабільнае прыкладанне «Музей+», D3D Mini – кампактны 3D-прынтар, які з'яўляецца канструктарам, што можна сабраць самому; PROpodarki – стварэнне эксклюзіўных падарункаў. Сярод удзельнікаў другога патоку стартап-школы і праект, які ўжо паспеў ярка заявіць пра сябе, – «Насімая электроніка EL-Sense», ён стаў пераможцам у конкурсе INNSTART-BSU.

– Ідэю свайго праекта – стварыць вынаходства для адсочвання стану здароўя і аналізу навакольнага асяроддзя – мы з камандай прыдумалі ў сталовай за абедам, і ў прынцыпе шмат чаго змаглі рэалізаваць сваімі сіламі: вырашыць розныя пытанні, звязаныя з тэхнічным складнікам, распрацаваць дызайн першай прылады, – распавядае кіраўнік «Насімай электронікі EL-Sense» **Аляксандр СЕМЯНОВІЧ**. – Аднак адна справа прыдумаць і зрабіць штосьці сваё, іншая – прадаць гэта. У стартап-школу мы прыйшлі менавіта для таго, каб навучыцца прадаваць свой прадукт. Без ведаў, як правільна складаць бізнес-план, прадумваць стратэгію, без разумення, як фінансава суправаджаць праект, запусціць свой стартап проста немагчыма. Усяму гэтаму мы вучымся і да выпуску са школы хочам дасягнуць узроўню, калі зможам знайсці інвестараў, якім наш праект будзе цікавы. Цяпер мы выйшлі на фінішную прамую і плануем першы продаж нашых прылад на сярэдзіну чэрвеня.

Удзельнікі анлайн-стартап-школы «СІТА 2.0» пачалі навучанне ў канцы сакавіка, ім трэба яшчэ прайсці больш за 18 гадзін анлайн-навучання па soft&hard skills і засвоіць такія важныя для прадпрымальніка тэмы, як бізнес-план, маркетынг, прасоўванне прадукту на рынку, бізнес-мадэль, сацыяльныя кампетэнцыі і асабісная эфектыўнасць, фінансавае і юрыдычнае суправаджэнне інтэлектуальнай уласнасці.

Падрыхтавала
**Валерыя БАНДАРЧЫК**



*Кансультант па кіраванні, сузаснавальнік дзелавой супольнасці Minsk Knowledge Office Андрэй Мірашнічэнка праводзіць трэнінг «Бізнес-мадэль» для ўдзельнікаў хакатону*



*Данііл Елісееў прэзентуе «Інжынерную станцыю D3D Cube» у рамках конкурсу інавацыйных работ INNSTAR*



«Рухальнай сілай любога грамадства з'яўляюцца людзі, якія ўмеюць ствараць новае. Я лічу, што ўніверсітэт – гэта канцэнтрацыя такіх людзей. Таму мы шукаем не тых, хто хоча проста зарабляць грошы. Мы шукаем тых, хто хоча ствараць новае і карыснае, а таксама ганарыцца тым, што робіць. І вучым, як на гэтым можна зарабляць».

**Дзмітрый МІКУЛКА,**
кіраўнік Стартап-цэнтра




*Выява ілюструе назву і канцэпцыю стартап-школы «СІТА»: на складаным і працяглым шляху да паспяховага бізнесу застаюцца толькі годныя праекты і нацэленыя на поспех прадпрымальнікі*





# 75 гадоў танцаў

Руплівасць, якая раскрывае таленты, пастаяннае абнаўленне і ўменне працаваць у вялікай камандзе – асноўныя складнікі поспеху заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца «Крыжачок» БДУ.

## Юбілейны год заслужанага ансамбля танца «Крыжачок»

Гісторыя выдатнага ансамбля «Крыжачок» непарыўна звязана з гісторыяй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Студэнцкі танцавальны калектыў быў створаны ў 1945 годзе, адразу пасля Другой сусветнай вайны. Яго першымі ўдзельнікамі станавілася студэнцкая моладзь з ліку дэмабілізаваных воінаў. Напачатку ў склад уваходзілі толькі навучэнцы і супрацоўнікі БДУ, але крыху пазней сталі далучацца студэнты і выпускнікі іншых УВА.

«Крыжачок» за доўгія гады існавання змяніў некалькі кіраўнікоў. Першым кіраўніком тады яшчэ танцавальнай групы была **Ларыса Канстанцінаўна АЛЕКСЮТОВІЧ**. Пазней калектыў узначаліў заслужаны работнік культуры БССР **Мікалай Вікенцьевіч ЛАПША**. Ён прыдумаў назву ансамблю, якая і і сёння застаецца на слыху, і менавіта са з'яўленнем такога выбітнага настаўніка пачаў адбывацца росквіт калектыву. Пасля сыходу Мікалая Вікенцьевіча з жыцця змянілася нямала таленавітых кіраўнікоў, пры якіх ансамбль працягваў дасягаць вялікіх поспехаў. З 2008 года і дагэтуль галоўным балетмайстрам «Крыжачка» з'яўляецца заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь **Ігар Юр'евіч МУЗАЛЕЎСКІ**. Пасля завяршэння сваёй прафесійнай кар'еры ў якасці артыста балета ён быў запрошаны ў ансамбль для працы мастацкім кіраўніком.



*Мастацкі кіраўнік «Крыжачка» Ігар Музалеўскі разам з удзельнікамі калектыву*



### Духоўнасць ад пакалення да пакалення

«Крыжачок» у сваёй творчасці папулярызуе беларускую нацыянальную культуру, умацоўвае традыцыі высокай духоўнасці, спрыяе фарміраванню маральнага патэнцыялу студэнцкай моладзі. Але самая вялікая яго заслуга заключаецца ў тым, што ён выхаваў не адно пакаленне таленавітых людзей, якія любяць сваю краіну, народнае мастацтва і перадаюць гэтую любоў сваім нашчадкам.

Зараз у ансамблі займаюцца 48 чалавек, сярод якіх і музыкі жывога аркестра. Усе яны – адзіны, суладны і згуртаваны арганізм, здольны з году ў год скараць новыя вяршыні. Балетмайстар на пытанне, ці можа ён кагосьці вылучыць з каманды, адказаў, што «ўсе класныя, усе малайчыны, і не хацелася б кагосьці вылучаць».

«Як такога адбору пачаткоўцаў у нас няма, – распавядае кіраўнік ансамбля. – Бо калектыў увесь час задзейнічаны на розных мерапрыемствах, ён навідавоку і не мае патрэбы ў рэкламе. У „Крыжачок“ прыходзяць як навучэнцы БДУ, так і студэнты іншых навучальных устаноў, і кожнаму даецца шанец адчуць сябе часткай калектыву. Мы нікому не адмаўляем. Але з 18 чалавек, якія прыходзяць у сезон, застаюцца 1 ці 2, якія вытрымалі велізарныя нагрузкі і дайшлі да канца сезона. Ім гонар і хвала».

### Самае галоўнае – гэта ідэя

Немагчыма сказаць, якую агульную колькасць пастановак налічвае рэпертуар ансамбля, бо «Крыжачок» часта запрашаюць удзельнічаць у шматлікіх канцэртах, дзе акампануюць аркестры ці выступаюць выканаўцы. Балетмайстар увесь час стварае абсалютна новыя нумары, але яны, як правіла, з'яўляюцца разавымі. Нароўні з гэтым у рэпертуары калектыву штогод з'яўляецца некалькі «навінак». У цэлым, за пяць гадоў абнаўляецца каля 30 % рэпертуару. «Працоўнымі» можна назваць прыкладна 25 харэаграфічных твораў, іх удзельнікі могуць успомніць і ўзнавіць за пару рэпетыцый.

«Самае галоўнае – гэта ідэя, – тлумачыць галоўны балетмайстар тое, як ствараюцца новыя пастаноўкі. – Калі ідэя ёсць, я раблю эцюд, які развіваю, прапаную розныя варыяцыі, здымаю ўсё на відэа, праглядаю велізарную колькасць разоў, дапрацоўваю і ў канчатковым выніку атрымліваю новую пастаноўку». Рыхтаваць харэаграфічныя творы, вядома, прасцей пад ўжо гатовую музыку. З гэтым калектыву дапамагае кіраўнік аркестра: ён стварае для «Крыжачка» музычны матэрыял. Таксама некаторыя нумары ставіліся пад музыку, якую знаёмыя ансамбля даслалі з-за мяжы. Напрыклад, для сюіты «Фрэйлехс» музычны твор адправілі наўпрост з Ізраіля.

За сваю 75-гадовую гісторыю «Крыжачок» пабываў з гастролямі ў самых розных кутках свету. «У наш час калектыў выязджае раз-два ў год, а хацелася б часцей, – распавядае Ігар Юр'евіч. – І самае запамінальнае ў такіх паездках – гэта новыя знаёмствы і размовы з цікавымі людзьмі». У сакавіку 2020 года ансамбль павінен быў прадставіць сваю творчасць у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, але з-за неспрыяльнай сітуацыі ў свеце дадзеныя гастролі перанесліся на пазнейшы час.

### Поспех – у працы і людзях

Ансамбль заваёўваў мноства ўзнагарод і тытулаў. Але самай значнай узнагародай з'яўляецца званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь», якое ансамбль атрымаў у 2011 годзе і зараз абавязаны кожныя 5 гадоў яго пацвярджаць.

Поспех калектыву, па меркаванні мастацкага кіраўніка, у працы і людзях, якія прыйшлі і займаюцца гадамі, зацята і ўпарта працуюць. «Гэта „касцяк“, да якога паступова дадаюцца ўжо новыя ўдзельнікі, але на якім усё трымаецца».

### Святочны сакрэт і цікавасць моладзі

Юбілейны год для калектыву пачаўся з удзелу ў канцэртнай праграме, якая завяршала цырымонію ўручэння прэміі «За духоўнае адраджэнне». Да гэтага сур'ёзнага мерапрыемства была падрыхтавана новая надзвычай прыгожая харэаграфічная пастаноўка. Напярэдадні вялікага 75-гадовага юбілею заслужаны аматарскі ансамбль танца ўжо павіншавалі на ранішнім шоу «Добрай раніцы, Беларусь!» на «Беларусь 1». Таксама падрыхтавалі сюжэт пра «Крыжачок» на тэлеканале «Культура». Самыя значныя мерапрыемствы былі запланаваны на вясну і лета. Напрыклад, у канцы красавіка на сцэне Белдзяржфілармоніі анансаваўся канцэрт заслужанага ансамбля да яго 75-годдзя, у якім павінны былі прадставіць беларускія нумары і танцы народаў свету, а напрыканцы прадэманстраваць новую харэаграфічную пастаноўку, назва якой да прэм'еры будзе трымацца ў сакрэце. Удзельнікі рыхтаваліся да гэтага найважнейшага для іх мерапрыемства паўгода, аднак зараз мы ўбачым яго толькі 4 лістапада 2020 года.

Народныя танцы заўсёды мелі прыхільнікаў. Быў таксама час, калі мода на іх сыходзіла. Але сёння публіка ўсё часцей выяўляе да іх сімпатыю. «Старэйшае пакаленне і многія людзі сярэдняга ўзросту ніколі не пакідалі нас. А цяпер да іх далучаецца вельмі шмат моладзі, якая вельмі цікавіцца нацыянальнай харэаграфіяй. Паглядзець на нашы вялікія сольныя канцэрты прыходзяць як людзі, якія маюць непасрэднае дачыненне да сферы танцаў, напрыклад, рэжысёры, іншыя калектывы ці школы, так і людзі, якія проста любяць і паважаюць нашу творчасць», – сцвярджае кіраўнік ансамбля танца Ігар Музалеўскі.

**Гутарыла**
**Анастасія БАЛТОЎСКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
18 мая 2020 года, № 8 (2230)






## Ветэраны БДУ, якія з намі

БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
**Гаравец Валянціна Канстанцінаўна**

ФАКУЛЬТЭТ ГЕАГРАФІІ І ГЕАІНФАРМАТЫКІ
**Фешчанка Фёдар Сяргеевіч**

ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
**Котаў Альберт Іосіфавіч**

ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
**Карасёва Алена Васільеўна**

ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ
**Львова Надзея Барысаўна**
**Сачанка Іван Іванавіч**

ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
**Давідзюк Георгій Пятровіч**

ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
**Цегін Леанід Рыгоравіч**

ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
**Чыгір Васіль Фёдаравіч**

КАФЕДРА ЗАМЕЖНЫХ МОЎ
**Янушкевіч Ганна Вікенцьеўна**

УПРАЎЛЕННІ І АДДЗЕЛЫ
**Шымко Ларыса Аляксандраўна**

СТУДЭНЦКІ ГАРАДОК
**Гурын Яўген Аляксандравіч**
**Яцкевіч Кацярына Міхайлаўна**

СЛУЖБА АХОВЫ І БЯСПЕКІ
**Пермякоў Пётр Іванавіч**
**Савейка Зоя Іванаўна**

# «Абвясціў сябе мабілізаваным…»

**Працяг. Пачатак на с. 1**

### Даведацца пра лёс кожнага

Традыцыйна ў памяць пра студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, загінулых падчас Вялікай Айчыннай вайны, супрацоўнікі і студэнты ўсклалі кветкі да мемарыяльнага знака «Памяць у імя жывых». Каля яго зараз усталяваны памятны знак з QR-кодам аднайменнага анлайн-мемарыялу. У ім, дзякуючы старанням гістарычнага факультэта, можна падрабязна даведацца пра 67 асоб, якія страцілі сваё жыццё. Пра працэдуру іх пошуку распавяла **Аліна ВЕРАМЕЙЧЫК,** намеснік дэкана гістарычнага факультэта па вучэбнай і выхаваўчай рабоце:

– Праца па пошуку выконваецца з 1943 года, калі ўніверсітэт аднавілі на станцыі Сходня, у цяперашніх Хімках пад Масквой. Меркаваных загінулых каля трохсот чалавек, аднак дакладна ўсталяваны толькі 67. Гэта няпроста: мы шукаем інфармацыю пра загінулых у архівах КДБ, ФСБ, Нацыянальным архіве Беларусі, але вялікая колькасць звестак пра вайну згублена. На дапамогу прыходзяць студэнты, якія звязваюцца і апытваюць родных.

### Замест сваякоў

Не забыты і жывыя ветэраны. Напярэдадні свята цэнтр добраахвотніцкай дзейнасці «Абдымкі» БРСМ БДУ наведалі ветэранаў, каб павіншаваць, перадаць матэрыяльную дапамогу, прадукты і сродкі індывідуальнай абароны. Апошня ў рамках акцыі дапамогі пажылым людзям праспансіравала спартыўная інклюзіўная арганізацыя «Крылы анёлаў». **Алена ГРЫШКІНА,** сацыяльны педагог аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ, заўважае:

– Гэта вельмі даўняя традыцыя ў БДУ, і эпідэміялагічная сітуацыя не стала перашкодай. Мы ўважліва паставіліся да ўсіх 15 ветэранаў, а вось ад гарбаты з працяглымі гутаркамі прыйшлося адмовіцца: беражом здароўе пажылых людзей. Яны заўсёды вельмі ўдзячныя і рады нашай увазе, дапамозе, клопату.




На жаль, ёсць і тыя героі вайны, пра якіх няма каму паклапаціцца – сваякі не знойдзены ці згубіліся. Шэфства над такімі пахаваннямі ўзялі на сябе супрацоўнікі і студэнты БДУ. У красавіку-маі яны даглядалі магілы Героя СССР ***Уладзіміра Каргузалава*** і рэктара БДУ падчас ВАВ ***Парфёна Савіцкага***. Першы быў пахаваны на тэрыторыі ўнутранага дворыка БДУ, паколькі тут загінуў у 1944. Да 1990-х яго перанесенае на Ваенныя могілкі пахаванне даглядалі, праводзілі патрыятычныя акцыі. І сёлета гэта традыцыя зноў адрадзілася.

– Помнікам часцяком надаецца ўвага толькі раз у год, аднак рабіць гэта трэба часцей, бо людзі не проста так паклалі жыццё, змагаючыся за нашу будучыню. Догляд за надмагіллямі гэтых людзей з'яўляецца нашым унёскам у памяць пра іх. Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю сваім прыкладам імкнецца паказаць, што неабходна паважаць гісторыю свайго народа, – выказаўся **Яўген БАРОЎКА,** намеснік начальніка УВРМ.

### Упершыню ў анлайн-фармаце

Грунтоўна да святкавання 75-годдзя падрыхтаваўся гістарычны факультэт. На сваім ютуб-канале ён выпусціў два дакументальныя фільмы: «Гістарычны факультэт дарогамі вайны», на падрыхтоўку якога сышло два гады, і «Наша памяць – без тэрміну даўнасці» разам з аддзелам рэдкай і каштоўнай кнігі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

Міжнародная навуковая канферэнцыя «Вялікая Айчынная вайна ў лёсе беларускага народа», якая прайшла 23 красавіка ўпершыню для гістарычнага факультэта ў анлайн-фармаце, сабрала каля 70 удзельнікаў з розных краін. Тэма Вялікай Айчыннай не вычарпана – дакладчыкі гэта пад сумнеў не ставяць, а, наадварот, пераканаўча даказваюць.

Ужо які год галоўныя арганізатары навуковага мерапрыемства – гістарычныя факультэты БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава. Сярод суарганізатараў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд развіцця і падтрымкі арменазнаўчых даследаванняў «АНІВ», пярвічная арганізацыя РГА «Белая Русь» БДУ. Да канферэнцыі далучыліся ўсе гістарычныя факультэты рэгіянальных ВНУ, удзельнікі з Расіі, Кыргызстана і Таджыкістана.

Яна стала першай поўнамаштабнай анлайн-канферэнцыяй на факультэце, і такі досвед, як падкрэслівае дэкан гістфака БДУ **Аляксандр КАХАНОЎСКІ,** выдатнае рашэнне ў дадзенай сітуацыі:

– Гэта важная падзея ў навуковым і грамадскім жыцці нашай краіны. Гісторыкі і даследчыкі заўсёды вяртаюцца да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, і, чым далей мы сыходзім у часе ад тых падзей, тым больш мы разумеем, як мала ведаем.

### «БДУ быў мабілізаваны…»

7 мая з анлайн-лекцыяй «Універсітэт абвясціў сябе мабілізаваным…» выступіў загадчык кафедры гісторыі Расіі **Алег ЯНОЎСКІ.** Ён падзяліўся эксклюзіўнымі, малавядомымі фактамі пра БДУ ў Вялікай Айчыннай вайне, універсітэцкую ваенную падрыхтоўку і герояў сярод супрацоўнікаў і студэнтаў. Рыхтуючыся да лекцыі-гутаркі, прафесар перагледзеў дзясяткі крыніц, каб прадставіць найбольш поўную карціну працы папярэднікаў у гады вайны, паспрабаваў скласці шырокі летапіс з дэталямі ўдзелу калектыву БДУ ў рамках вайны і прадэманстраваць дасягненні Вялікай Перамогі. Выявілася, што ваенна-фізкультурнай падрыхтоўцы надавалі ўвагу ва ўніверсітэце з 1921 года. Да яе прыклаў руку маршал Перамогі Георгій Жукаў, які вёў спецыяльныя заняткі ў БДУ і сябраваў з выкладчыкамі і рэктарам У. І. Пічэтам.

26 дапытлівых студэнтаў праверылі свае веды ў агульнаўніверсітэцкім анлайн-конкурсе «Парад Перамогі». Пераможцай стала студэнтка 3 курса факультэта міжнародных адносін **Ганна Палаўкова,** набраўшы 355 балаў з 400 магчымых. 2-е месца дасталася **Данілу Гутоўскаму** з факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі, 3-е – **Алене Туравец** з гістарычнага факультэта. Пераможцай «За самы хуткі правільны адказ» стала студэнтка гістарычнага факультэта **Ганна Чыгір**.

Партрэтную галерэю 12 Герояў Савецкага Саюза з супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ прадставілі пераможцы і ўдзельнікі конкурсу «Студэнт года БДУ–2019». У акцыі «Мы – нашчадкі Перамогі!», якую падрыхтаваў аддзел моладзевых праграм і праектаў УВРМ, актывісты распавялі пра герояў і сваё стаўленне да свята Перамогі.

Выказаць свае пачуцці вершамі можна было ў паэтычным флэшмобе «БДУ. 75 вершаў пра вайну», які стартаваў у канцы сакавіка дзякуючы ўпраўленню па справах культуры. Рыфмаваныя радкі цытавалі не толькі студэнты, але і студэнцкія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і іх дзеці.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

18 мая 2020 года
Падпісана да друку 14.05.2020 г.
Зак. 106. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспл. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***